http://edoc.bseu.by:8080

начинают буреть. Арбузы дозреют и будут храниться намного дольше, чем снятые в полной спелости. Хранят полосатые ягоды при температуре плюс 2–3 градуса и относительной влажности воздуха 80–85 %. При таких условиях они не теряют своих качеств в течение 3 месяцев. Плоды укладывают в один слой на сухую солому хвостиком вверх, следя за тем, чтобы они не соприкасались боками. Можно подвесить и в сетках.

**Список литературы**

1. *Валько, В. П.* Особенности биотехнологического земледелия / В. П. Валько, А. В. Щур; М-во сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь, УО «Белорусский государственный аграрный технический университет». – Минск: БГАТУ, 2017. – 192 с.

2. Обучение учащихся основам предпринимательства через реализацию региональных инициатив / сост.: Г. Ф. Бедулина, Л. А. Кивлюк. – Минск: РИВШ, 2019. – 362.

3. *Нуризянов, М. Р.* Развитие ценностных ориентаций личности в процессе экологического образования / М. Р. Нуризянов // Научная библиотека им. Н. И. Лобачевского [Электронный ресурс]. – Режим доступа: libweb.kpfu.ru/z3950/phil/638121/058-060.pdf. – Дата доступа: 05.12.2020.

4. *Титаренко, Л. Г.* Система экологических ценностей населения Республики Беларусь / Л. Г. Титаренко // Социология. – 2012. – № 3. – С. 111–122.

5. *Титаренко, Л. Г.* Типы экологического поведения: Homo ecologus vs. Homo consumer / Л. Г. Титаренко // Социолог. альм. – 2015. – Вып. 6. – С. 105–115.

*Бабіч Г. Г.,*
настаўнік геаграфіі ДУА «Вучэбна-педагагічны комплекс
Лядзенскі дзіцячы сад – сярэдняя школа»
Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці

# АСАБЛІВАСЦІ ДЭМАГРАФІЧНАЙ СІТУАЦЫІ Ў ЛЯДЗЕНСКІМ КРАІ Ў КАНЦЫ XX – ПАЧАТКУ XXI СТ.

Дэмаграфічнай сітуацыі ў нашай краіне надаецца значная ўвага. У 2002 г. быў прыняты Закон «Аб дэмаграфічнай бяспецы Рэспублікі Беларусь». Ен прынёс пэўныя станоўчыя вынікі. Так, пачынаючы з 2013 г. колькасць насельніцтва стабілізавалася каля 9,5 млн чалавек.

Працягласць жыцця ў Беларусі за апошнія 20 гадоў павялічылася на 5,5 гадоў і складала ў чэрвені 2018 г. 74,4 года. У лепшы бок змяніліся некаторыя дэмаграфічныя паказчыкі і ў Чэрвеньскім раёне.

Колькасць насельнітцтва ў Чэрвеньскім раене ў раене ў 1920-я – 1930-я гады расло і дасягнула свайго максімуму ў перадваенным 1940 годзе – 51 530 чалавек. Вялізныя страты панесла Чэрвеньшчына за гады Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вызвалення ад захопнікаў у 1944 годзе колькасць насельніцтва ў раёне складала ўсяго 35 990 чалавек і скарацілася на 15 549 чалавек, або 30 %. У пасляваенны час колькасць насельніцтва

ў раёне паступова адраджалася. Так, па дадзеных перапісу насельніцтва 1989 г. на тэрыторыі раёна пражывала 41 603 чалавекі. У канцы XX ст. пачалося новае зніжэнне, а ў апошнія гады колькасць насельніцтва ў раене стабілізавалася каля лічбы 32 тыс. чалавек. На 1 студзеня 2020 г. у Чэрвеньскім раене налічвалася 33,4 тыс. чалавек.

Насельніцтва Лядзенскага сельсавета максімальнай колькасці дасягнула ў перадваенным 1940 г. – 4991 чалавек. У пасляваенныя гады колькасць насельніцтва скарачалася да 1870 чалавек у 1989 г., а пасля тройчы перыядычна павялічвалася і зноў памяншалася. На 1 студзеня 2018 г. колькасць жыхароў Лядзенскага с/с складала 1897 чалавек. Прычынамі пэўнай стабілізацыі колькасці насельніцтва і яго перыядычнымі павелічэннямі з'яўляюцца тры ўзбуйненні Лядзенскага с/с. Першае ўзбуйненне адбылося ў канцы 1989 г., калі былі далучаны пяць населеных пунктаў са складу Калодзежскага сельсавета з агульнай колькасцю насельніцтва 468 чалавек. Другое ўзбуйненне 2010 года прыбавіла ў склад сельсавета 9 вёсак былога Хутарскага с/с агульнай колькасцю 315 чалавек. У 2013 г. адбылося трэцяе ўзбуйненне. Былі далучаны яшчэ 12 вёсак з агульнай колькасцю насельніцтва 504 чалавекі. Такім чынам усяго было далучана 26 населеных пунктаў і 1287 чалавек насельніцтва. Нягледзячы на гэта зніжэнне колькасці насельніцтва па Лядзенскаму с/с працягваецца.

Калі ўлічваць толькі тыя населеныя пункты, якія з самага пачатку ўваходзілі ў склад сельсавета, то мы ўбачым іншую карціну. Колькасць насельніцтва ўвесь час зніжалася да пачатку 1990-х гадоў, а затым быў невялікі перыяд, прыкладна дзесяцігоддзе, калі быў невялікі рост. З чым гэта звязана? Па-першае, гэта вынік наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Частка насельніцтва з забруджаных радыяцыяй раёнаў перасялялася ў іншыя мясцовасці, у тым ліку і ў наш край. Была створана праграма пераадолення наступстваў катастрофы, выдзелены сродкі, пачалося будаўніцтва жылля для перасяленцаў. Па-другое, гэта вынік паспяховага кіраўніцтва мясцовай гаспадаркай у той час. Было пабудавана шмат новых дамоў для «чарнобыльцаў», для спецыялістаў сельскай гаспадаркі, для маладых сем'яў, якія працавалі ў гаспадарцы. Так з'явіліся вуліцы Новая ў в. Ляды і Азёрная ў в. Луч. Аднак эканамічны крызіс, які ахапіў прасторы былога Савецкага Саюза пасля яго распаду, не абыйшоў і наш край. Кароткачасовы ўздым колькасці насельніцтва завяршыўся і пачаўся яго спад.

Калі параўнаць змены ў колькасці насельніцтва ў Лядзенскім с/с і ў Чэрвеньскім раене пачынаючы ад перапісу 1989 г., то мы атрымаем наступныя вынікі: па Чэрвеньскаму раёну насельніцтва скарацілася за апошнія 30 гадоў на 23,1 %, па Лядзенскаму с/с на 48,4 %. Калі параўнаць гэтыя змены з 1940 г., то мы атрымаем наступныя вынікі: па Чэрвеньскаму раену насельніцтва скарацілася на 37,9 %, а па Лядзенскаму сельсавету – на 80,7 %. Гэта значыць, што скарачэнне колькасці насельніцтва ў нашай

мясцовасці адбывалася і адбываецца прыкладна ў два разы хутчэй, чым у сярэднім па раену.

Асновай росту колькасці насельніцтва з’яўляецца натуральны прырост, які фарміруецца нараджальнасцю і смяротнасцю. Натуральны прырост у Беларусі хутка паніжаўся ў 60–80-х гг. XX ст. Яшчэ больш ён знізіўся ў 1990-х гг. У выніку ў Беларусі істотна скарацілася ўзнаўленне насельніцтва. У 1993 г. упершыню ў рэспубліцы ў пасляваенны час нарадзілася людзей менш (на 11 тыс. чалавек), чым памерла. Каэфіцыент натуральнага прыросту стаў адмоўным. У 2002 г. смяротнасць насельніцтва перавышала нараджальнасць у 1,6 раза. Пасля гэтага натуральнае выбыцце насельніцтва стала штогод зніжацца.

У Чэрвеньскім раене ў гэтыя гады каэфіцыент натуральнага прыросту таксама стаў адмоўным. Так, каэфіцыент нараджальнасці ў 2014 г. быў у межах 12, каэфіцыент смяротнасці ў межах 16, а каэфіцыент натуральнага прыросту ў межах – 4. У 2019 г. гэтыя каэфіцыенты істотна не змяніліся: 10,6; 15,2; 4,6.

Каэфіцыент натуральнага прыросту (убытку) па Лядзенскаму с/с найбольшых велічынь дасягае ў 1996–2005 гг. – ад –15 ў 1996 г. да –27,5 у 2001 г. У 2006–2018 гг. каэфіцыент крыху зніжаецца. У апошнія гады каэфіцыент па Лядзенскаму с/с ў межах (–19,5) – (–19,3).

Калі параўнаць каэфіцыент натуральнага ўбытку па Лядзенскаму сельсавету з адпаведнымі паказчыкаміі па астатніх сельсаветах Чэрвеньскага раена, то мы ўбачым, што ён самы высокі ў раёне і перавышае сярэднераённы каэфіцыент прыкладна ў пяць разоў.

Такім чынам каэфіцыент натуральнага ўбытку па Лядзенскаму сельсавету сведчыць аб вельмі цяжкай дэмаграфічнай сітуацыі, якая склалася ў краі. Калі падлічыць далейшае зніжэнне колькасці насельніцтва ў адпаведнасці з сеняшнімі паказчыкамі, то праз дзесяць гадоў застанецца 675 жыхароў, а праз 30 гадоў у краі можа застацца толькі 95 чалавек. Каб не дапусціць такога далейшага развіцця неабходны тэрміновыя меры.

Мы бачым некалькі як аб’ектыўных, так і суб’ектыўных прычын, якія прывялі наш край у цяжкае дэмаграфічнае становішча. Лядзенскі с/с знаходзіцца далека ад буйных цэнтраў на паўднева-ўсходняй ускраіне Чэрвеньскага раена і на ўскраіне Мінскай вобласці. Сельская і лясная гаспадарка даюць асноўныя рабочыя месцы ў нашым краі.

Мы разумеем непазбежнасць скарачэння колькасці насельніцтва ў сельскай мясцовасці па меры развіцця краіны. Тая колькасць насельніцтва ў весцы, якая была раней цяпер проста непатрэбна. Ва ўсім свеце добра вядома заканамернасць, што чым вышэйшы ўзровень эканамічнага развіцця краіны, тым меншая колькасць насельніцтва занята ў сельскай гаспадарцы. У структуры занятасці насельніцтва для большасці краін з высокім узроўнем эканамічнага развіцця ўдзельная вага занятых у сельскай гаспадарцы рэдка перавышае 5–6 %. Доля сельскай гаспадаркі ў ВУП гэтых краін ад 1–2 %

да 10 %. Сельская гаспадарка Беларусі забяспечвае 5,1 % ВУП краіны, у ей занята 9,7 % насельніцтва. Як бачым, паказчыкі Беларусі сведчаць, што мы ідзем у тым жа накірунку. А гэта значыць, што ў далейшым можна не чакаць павелічэння рабочых месц у сельскай гаспадарцы. Хутчэй наадварот. Важна захаваць хаця б тыя рабочыя месцы, якія маюцца.

Мясцовыя ўлады гатовы аказваць усялякую падтрымку адкрыццю малога бізнесу ў краі. Аказваецца падтрымка ў набыцці і арганізацыі дачных гаспадарак. Маленькія вескі ўсе больш пераўтвараюцца ў дачныя пасяленні. Дачныя будынкі звычайна добра дагледжаны, агароджаны, упрыгожаны. Няхай хоць летам, але гэтыя весачкі будуць жыць. Ужо зараз у сельсавеце колькасць дамоў з непастаяннымі жыхарамі перавышае колькасць дамоў з пастаяннымі жыхарамі.

Адзін з важнейшых фактараў развіцця краю – захаванне школы. У ХХ ст. на тэрыторыі краю мелася 12 пачатковых, 2 базавыя і адна сярэдняя школы. Зараз засталася толькі адна – Лядзенская школа. Удзел у праекце «Арганічная гаспадарка» – адна з магчымасцей захаваць школу, садзейнічаць яе далейшаму развіццю ў сучасных умовах.

Мы верым у лепшую будучыню. Верым, што ў нашым краі будуць заўсёды жыць людзі, працаваць, ствараць сем'і, гадаваць дзяцей і любіць свой край.

**Спіс литаратуры**

1. Обучение учащихся основам предпринимательства через реализацию региональных инициатив / сост. Г. Ф. Бедулина, Л. А. Кивлюк.– Минск: РИВШ, 2019. – 362 с.

2. *Титаренко, Л. Г.* Типы экологического поведения: Homo ecologus vs. Homo consumer / Л. Г. Титаренко // Социолог. альм. – 2015. – Вып. 6. – С. 105–115.

3. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2030 года // Эконом. бюл. Науч.-исслед. эконом. ин-та М-ва экономики Респ. Беларусь. – 2015. – № 4. – 99 с.

4. Непрерывное воспитание детей и учащейся молодежи. Концепция. Программа на 2016–2020 годы. – Минск: НИО, 2016. – 84 с.

*Бебешко А. Ф.,*
учащаяся 9 класса ГУО «Учебно-педагогический комплекс
Ляденский детский сад – средняя школа»
Червенского района Минской области

## РОЛЬ СЕЛЬСКОГО ХОЗЯЙСТВА В ЖИЗНИ ШКОЛЬНИКОВ

Нет смысла говорить, как сильно необходимо любой стране сельское хозяйство. В жизни каждого человека оно играет свою, незаменимую роль. Эта отрасль обеспечивает страну зерновыми, бобовыми и другими культурами, молоком, мясом и т. д. Он настолько широк, что может удовлетворить спрос даже самого привередливого покупателя.